# ДАЛЕЙ – РАЗАМ

**14 лістапада ў Гродне ўшанавалі творцаў, прынятых у Саюз пісьменнікаў Беларусі ў 2024 годзе.**

Мерапрыемства пад назвай «Новых вітаем сяброў» з'яўляецца для Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ традыцыйным. Шэрагі нашай пісьменніцкай арганізацыі пастаянна папаўняюцца. Некалькі гадоў таму нарадзілася ідэя літаратурнага вечара-прэзентацыі, мэты якога – пазнаёміць шырокую грамадскасць з асобай сучаснага айчыннага літаратара, прадэманстраваць творчы патэнцыял Саюза пісьменнікаў Беларусі і яго асобных членаў, а таксама прыцягнуць увагу да літаратурнага жыцця Прынёманскага краю і нават прапанаваць усім далучыцца да літаратурнага працэсу. Тым больш, што галоўным удзельнікам гэтага працэсу з'яўляецца чытач. Без яго ўвагі праца пісьменніка пазбаўляецца сэнсу. Аўтар і чытач – гэта непарыўнае адзінства, вечны, трывалы саюз. Невыпадкова менавіта гэтае слова – «Саюз» – стаіць на першым месцы ў назве нашай грамадскай арганізацыі.

Сёлета шэрагі Саюза пісьменнікаў Беларусі папоўнілі чатыры прадстаўнікі Гродзеншчыны: паэты Кацярына Каламійцава (Гродна) і Руслан Піваварaў (Ліда), краязнаўца Галіна Антонава са Смаргоні і гродзенскі публіцыст-гісторык Аляксандр Радзівонаў. Мерапрыемства сабрала вялікую колькасць аматараў мастацтва рознага ўзросту. Сярод прысутных у галоўным корпусе Гродзенскай абласной бібліятэкі можна было бачыць ветэранаў працы, педагогаў, работнікаў культуры і моладзь – навучэнцаў устаноў адукацыі горада над Нёманам. На тварах бачылася шчырая зацікаўленасць. Людзі прыйшлі з кветкамі, свяціліся ўсмешкамі. І свята атрымалася!



Пачалі афіцыйна. Адкрыла мерапрыемства намеснік дырэктара Дзяржаўнай установы культуры «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Карскага» Надзея Сяргееўна Давыдзік. Да нававбранцаў СПБ з прывітальным словам звярнуліся старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена Васільеўна Пасюта, намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Сняжана Віктараўна Куратчык. З музычнымі нумарамі выступілі Марына Лаўрык (акардэон) і Рыта Васілеўская (вакал). Дарэчы, словы да адной з прагучаўшых песень напісала гродзенская паэтэса Святлана Барнавалава, якая таксама прысутнічала ў зале. Літаратура Гродзеншчыны, якая ствараецца на некалькіх мовах, даўно пацвердзіла свой высокі і важны статус надзейнага фундамента для духоўнасці і эфектыўнага сродку грамадскай кансалідацыі. Кожны з нашых новых калег па СПБ выступіў з кароткім аглядам сваёй творчасці. Адбыліся прэзентацыі кніг і твораў, прагучала паэзія. У фонд абласной бібліятэкі паступілі новыя аўтарскія выданні. Па папярэдняй дамоўленасці нашы новыя калегі адказалі на некалькі прынцыповых пытанняў:

-Чаму я вырашыў уступіць у Саюз пісьменнікаў Беларусі (ствараць літаратуру можна і самастойна, незалежна)?
-Чаго я чакаю ад Саюза пісьменнікаў Беларусі?
-Што Саюз пісьменнікаў Беларусі можа чакаць ад мяне?

Выступленні нававбранцаў Саюза атрымаліся змястоўнымі і вельмі шчырымі. Пісьменнік-педагог Аляксандр Радзівонаў падзяліўся ўласнымі творчымі знаходкамі і расказаў, наколькі важная гістарычная праблематыка ў сэнсе выхавання гарманічнай асобы. Паэтэса Кацярына Каламійцава выступіла з філасофскай і ваенна-патрыятычнай лірыкай, прадэманстраваўшы таксама свой эксперыментальны рэпертуар. Беларуская краязнаўца Галіна Антонава вельмі кранальна распавядала пра герояў сваіх кніг, пра тое, як важна шанаваць сваё, роднае, тое, што побач. Пісьменніца падарыла адразу некалькі сваіх кніг бібліятэцы і запрасіла гродзенцаў наведаць Смаргонь. Руслан Піваварaў вядомы аматарам айчыннай літаратуры і як ініцыятар літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет». Паэт засяродзіў увагу аўдыторыі на праблеме забруджвання нашых родных моў, прадэкламаваў некалькі вершаў, прэзентаваў свой зборнік духоўнай лірыкі «Свой крест» (2024). Нашы новыя калегі праявілі сябе не толькі як аўтары літаратурных твораў, але як сапраўдныя байцы грамадскага фронту, гатовыя да любых выклікаў нашага няпростага часу. Дыялог з грамадскасцю адбыўся ўжо ў новым для іх статусе. Новых калег павіншавалі з гэтай падзеяй: член СПБ, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, кандыдат філалагічных навук, літаратуразнаўца, літаратурны крытык, паэтэса Аліна Сабуць; член СПБ, кандыдат філалагічных навук, літаратуразнаўца, літаратурны крытык, паэтэса Святлана Тарасава; член СПБ, кандыдат гістарычных навук, публіцыст Уладзімір Ягорычаў; кандыдат на ўступленне ў СПБ, паэтэса Вольга Алізар.

І вось кульмінацыйны момант урачыстасці. Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла Антонаўна Кебіч прыняла нававбранцаў да ўрачыстай прысягі члена СПБ, пасля чаго сардэчна павіншавала іх з важнай падзеяй у жыцці, уручыла значкі і членскія пасведчанні арганізацыі. Літаратурна-музычны вечар-прэзентацыя завяршыўся, а творчыя шляхі нашых новых калег працягваюцца. Далей мы пакрочым разам.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** незабыўныя эпізоды літаратурна-музычнага вечара-прэзентацыі «Новых вітаем сяброў». Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Карскага, 14 лістапада 2024 года.




Калі ласка, знаёмцеся: нашы новыя калегі па Саюзе пісьменнікаў Беларусі Руслан Піваварaў, Кацярына Каламійцава, Галіна Антонава, Аляксандр Радзівонаў




Адкрыла мерапрыемства намеснік дырэктара Дзяржаўнай установы культуры «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Карскага» Надзея Сяргееўна Давыдзік




Да навабранцаў СПБ з прывітальным словам звярнулася старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена Васільеўна Пасюта





Некаторыя кнігі новых членаў Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ



Вядучы мерапрыемства, член СПБ, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык




Намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Сняжана Віктараўна Куратчык







Гродзенскі публіцыст, краязнавец Аляксандр Радзівонаў







Музычны падарунак ад Марыны Лаўрык (Гродзенская гімназія № 5 імя У. Караткевіча)











Паэтэса Кацярына Каламійцава (Гродна)






Спявае Рыта Васілеўская (Гродзенская гімназія № 5 імя У. Караткевіча)







Беларуская краязнаўца
са Смаргоні
Галіна Антонава



Кнігі пісьменніцы – у падарунак Гродзенскай абласной бібліятэцы









Паэт Руслан Півавараў (Ліда)










Новых калег з уступленнем у арганізацыю павіншавалі: член СПБ, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, кандыдат філалагічных навук, літаратуразнаўца, літаратурны крытык, паэтэса Аліна Сабуць; член СПБ, кандыдат філалагічных навук, літаратуразнаўца, літаратурны крытык, паэтэса Святлана Тарасава; член СПБ, кандыдат гістарычных навук, публіцыст Уладзімір Ягорычаў; кандыдат на ўступленне ў СПБ, паэтэса Вольга Алізар







Рэмарка ад Л. А. Кебіч




Гучаць словы Урачыстай прысягі члена Саюза пісьменнікаў Беларусі




ЗАЛОГ
ЗРОБЛЕНА У БЕЛАРУСІ


ЗАЛОГ ПОСП
ЗРОБЛЕНА У БЕЛАРУСІ


літаратурна-музычная сустрэча
«Новых вітаем сяброў»
ЗАЛОГ
ЗРОБЛЕНА У БЕЛАРУСІ




Пасведчання члена Саюза пісьменнікаў Беларусі некаторыя кандыдаты чакаюць па некалькі гадоў…









Старонкі новых членаў СПБ на афіцыйным сайце
Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ (рубрыка «Члены СПБ»):

**Аляксандр Радзівонаў:** http://www.pisateli.by/czleny/rodionov_a.pdf

**Кацярына Каламійцава:** http://www.pisateli.by/czleny/kolomiizeva.pdf

**Галіна Антонава:** http://www.pisateli.by/czleny/г_антонова.pdf

**Руслан Півавараў:** http://www.pisateli.by/czleny/пивоваров.pdf

***Фота:***
*Анатоля Апанасевіча,*
*Святланы Піваваравай,*
*Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага*